**Праект «Назіранне за выбарамі: тэорыя і практыка» абвяшчае набор на навучальны курс**

Belarus Watch, Еўрапейскі гуманітарны універсітэт (ЕГУ) і Беларускі Дом правоў чалавека ў выгнанні ў Вільні (ДПЧ) абвяшчаюць прыём заявак на ўдзел у праекце «Назіранне за выбарамі: тэорыя і практыка».

Абраныя ўдзельнікі пройдуць тыднёвы інтэнсіўны навучальны курс ў Вільні, распрацаваны выбітнымі айчыннымі і замежнымі даследчыкамі і палітолагамі, якія маюць досвед назірання ў шматлікіх міжнародных місіях. Навучанне складаецца з двух частак. У выпадку паспяховага сканчэння курса удзельнікі атрымаюць сертыфікат Belarus Watch, а таксама адмысловы сертыфікат ЕГУ.

Пасля першай часткі навучання слухачы курса возьмуць удзел у **міжнароднай місіі па назіранні за выбарамі ў адной з еўрапейскіх краін**, падчас якой удзельнікі атрымаюць практычны досвед у якасці акрэдытаваных кароткатэрміновых міжнародных назіральнікаў. Мэтанакіраваныя і актыўныя ўдзельнікі будуць запрошаныя на другую частку курса і яшчэ, прынамсі, адну місію па назіранні.

Першая частка курса пройдзе ў **кастрычніку 2012 г.**, другая - у **лютым** ці **сакавіку 2013 г.**

Патэнцыйныя кандыдаты ад **НДА** павінныя:

- мець ад 18 да 35 гадоў (абавязкова);
- запоўніць он-лайн заяву (абавязкова);
- займець рэкамендацыю ад дзейных няўрадавых арганізацыяў, грамадскіх ініцыятываў ці праектаў, якія карыстаюцца павагай, палітычных партый. Калі ласка, звярніце ўвагу: мы самі кантактуем з асобай, якая Вас рэкамендуе, таму дасылаць папяровую рэкамендацыю не трэба;
- прадэманстраваць моцную грамадскую пазіцыю, быць актыўнымі, цікавіцца назіраннем (абавязкова);
- з’уляцца сябрам няўрадавай арганізацыі ці палітычнай партыі альбо ўдзельнікам грамадскай ініцыятывы (абавязкова);
- мець магчымасць удзельнічаць у навучанні і непасрэдным назіранні ўвесь перыяд (абавязкова);
- пагадзіцца з правіламі ўдзелу ў праекце (абавязкова);
- размаўляць па-англійску і разумець англійскую мову (пажадана);
- быць гатовымі далучыцца да групы назіральнікаў ад праекту на бліжэйшыя парламенцкіх выбарах у Беларусі (пажадана).

Крытэры адбору:

- якасць матывацыі і вынікі сумоўя;
- высокі ўзровень грамадскай актыўнасці і цікаўнасць да назірання за выбарамі ў Беларусі;
- рэкамендацыя ад аўтарытэтных і прызнаных НДА, праваабаронцаў, грамадскіх актывістаў альбо палітыкаў ці палітычнай партыі.

Патэнцыйныя кандыдаты з **ЕГУ** павінныя:

- быць студэнтамі ЕГУ, залічанымі на дадзены момант на бакалаўрскія ці

магістэрскія праграмы (абавязкова);
- мець ад 18 да 35 гадоў (абавязкова);
- запоўніць он-лайн заяву (абавязкова);
- займець рэкамендацыю ад выкладчыка ЕГУ ці іншай аўтарытэтнай асобы. Калі ласка, звярніце ўвагу: мы самі кантактуем з асобай, якая Вас рэкамендуе, таму дасылаць папяровую рэкамендацыю не трэба;
- прадэманстраваць моцную грамадскую пазіцыю, быць актыўнымі, цікавіцца назіраннем (абавязкова);
- мець магчымасць удзельнічаць у навучанні і непасрэдным назіранні на ўвесь перыяд (абавязкова);
- пагадзіцца з правіламі ўдзелу ў праекце (абавязкова);
- прадставіць афіцыйнае пацверджанне аб акадэмічнай паспяховасці (пажадана) — магчыма атрымаць у 103 каб.;
- размаўляць па-англійску і разумець англійскую мову (пажадана);
- быць гатовымі далучыцца да групы назіральнікаў ад праекту на бліжэйшыя парламенцкіх выбарах у Беларусі (пажадана).

Крытэры адбору:
- якасць матывацыі і вынікі сумоўя;
- актыўная грамадская пазіцыя цікаўнасць да назірання за выбарамі ў Беларусі;
- акадэмічная паспяховасць.

Папярэдні досвед у назіранні за выбарамі, міжнароднымі ці мясцовымі, вітаецца, але не з'яўляецца абавязковым.

Заявы прымаюцца да **1 ліпеня 2012 г.** Заявы дасланыя пасля 23:59, 1 ліпеня разглядацца не будуць.

Он-лайн заяву можна запоўніць на http://eotp.info/application.

Усім кандыдатам будзе паведамлена аб выніках да **10 ліпеня 2012 г.**

Абраныя кандыдаты будуць запрошаныя на сумоўе (асабіста, альбо па тэлефоне ці праз skype), якое адбудуцца ў перыяд **з 4 па 6 ліпеня** 2012 г.

Дадатковая інфармацыя на сайце праекту (www.eotp.info). Па ўсім пытанням звяртайцеся на eotp@eotp.info.